**ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# СТАРОНКІ БІБЛІЯТЭЧНАГА ЖЫЦЦЯ ВОРАНАЎШЧЫНЫ

***Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь***

***3 квартал***
***Выпуск 59***

**Воранава 2019**

ББК 78.34
С77

Складальнік *В.М.Юрго*

Рэдактар *Н.В.Камінская*

Адказны за выпуск *Т.Р.Сушынская*

**Старонкі бібліятэчнага жыцця Воранаўшчыны**: інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”, Аддзел бібліятэчнага маркетынгу; [склад. В.М.Юрго].- Воранава, 2019.- 16 с.: фота.

У штоквартальным выданні “Старонкі бібліятэчнага жыцця Воранаўшчыны” прадстаўлены звесткі аб найбольш значных мерапрыемствах, якія прайшлі ў публічных бібліятэках Воранаўскага раёна ў трэцім квартале 2019 года.

Інармацйыйны матэрыял дапоўнены фотаздымкамі праведзеных мерапрыемстваў.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, а таксама для тых, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў Воранаўскім раёне.

ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”, 2019

# ВОРАНАЎСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА

**2 ліпеня**. Вусны часопіс “Дарогамі вайны дзеля Міру на зямлі” арганізавалі супрацоўнікі раённай бібліятэкі для вучняў 9 “В” класа. Дзеці падрыхтаввлі цікавыя паведамленні аб пачатку вайны, абароне Брэсцкай крэпасці, баях за г. Гродна, акупацыйным рэжыме на Беларусі, трагедыі Хатыні. Таксама вялі гутарку аб падзеях ваеннага часу на Воранаўшчыне.

**3 ліпеня** у Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, паэтычныя радкі аб'ядналі дзяцей і дарослых у тэатры ваеннай кнігі “І памяць подзвігу нам Кніга ажыўляе”. На імправізаванай паляне чыталі вершы, пад гармонік спявалі песні Перамогі.

Таксама бібліятэкары знаёмілі прысутных з кнігамі пра вайну, якія былі прадстаўлены на выставе “Гары, гары, агонь свяшчэнны, вечныя, як памяць наша, нашая любоў”, якая змяшчала цікавыя дакументальныя і мастацкія творы аб вызваленні Беларусі. Бібліятэкары правялі апытанне варанаўчан наконт лепшых кніг пра вайну. Быў арганізаваны міні-музей “Цягнік Перамогі”.

**25 ліпеня** было арганізавана літаратурнае падарожжа па творах “Чалавечнасць праўда ў творах Васіля Шукшына” (*да 85-годдзя з дня нараджэння*). Мерпарыемства знаёміла з жыццём і творчасцю пісьменніка, з самымі значнымі падзеямі ў яго жыцці, з яго роднымі і блізкімі. Акрамя гэтага, на працягу дня карыстальнікі мелі магчымасць паглядзець слайды, на якіх Васіль Макаравіч прадстаўлены такім, які ён быў у жыцці: праўдзівым, сумленным, адкрытым, - простая руская душа.

На кніжнай выставе прадстаўлена літаратура, сярод якой кнігі і часопісы, дзе распавядаецца аб жыцці і творчасці Васіля Макаравіча. Асаблівае месца на выставе занялі вядомыя творы, зборнікі яго апавяданняў і кінасцэнарыяў.

**1 жніўня** ў гарадскім парку пачала працу чытальная зала пад адкрытым небам, якая адразу прыцягнула ўвагу адпачываючых. Для чытання былі прадстаўлены кнігі і брашуры, часопісы і газеты, літаратура самых розных жанраў і напрамкаў аповесці, раманы, апавяданні, зборнікі вершаў, мастацкія і дакументальныя кнігі, гістарычныя і прыгодніцкія творы, класічная літаратура, дэтэктывы, любоўныя раманы, вясёлыя і сур'ёзныя кнігі. Увогуле, для ўсіх і для кожнага.

**1 верасня** ў Дзень ведаў Воранаўская раённая бібліятэка для вучняў 11 «А» і 11 «Б» класаў арганізавала пазнавальны ўрок “Па дарогах ведаў, або вучэнне з захапленнем”. Падчас сустрэчы гаварылі пра Дзень ведаў, гісторыю Дня беларускага пісьменства, прынялі ўдзел у інтэлектуальнай гульні, дзе вучням прадставілася магчымасць успомніць творы беларускай літаратуры, паказаць свае веды. З цікавасцю адказвалі на пытанні віктарыны, вырашалі смешныя задачы, адгадвалі загадкі. Да мерапрыемства была арганізавана выстава “Падарожжа па краіне ведаў”, якая знаёміла з мастацкімі творамі пра цікавае і займальнае школьнае жыццё .

**2 верасня** раённая бібліятэка прыняла актыўны ўдзел у рэспубліканскім Дні беларускага пісьменства, які прайшоў 1 верасня ў г.Слонім. У гарадскім парку разгарнулася бібліятэчная пляцоўка з тэатралізацыяй. Удзельнікі свята сталі сведкамі гістарычнай падзеі – сустрэчы Адама Міцкевіча з Марыляй Верашчакай.

Таксама вельмі цікавую і пазнавальную праграму падрыхтавалі для маленькіх удзельнікаў свята. Іх запрашалі на забаўляльныя гульні, інтэрактыўныя конкурсы і віктарыны.

**6 верасня** адзначылі 100-годдзе з дня нараджэння Алеся Асіпенкі (1919-1994), беларускага пісьменніка. У гэты дзень бібліятэка арганізавала вечар-партрэт "Залатыя струны душы".

**13 верасня** да Дня бібліятэк, аддзел бібліятэчнага маркетынгу арганізаваў Дзень адчыненых дзвярэй "Очень важна для человека – наша библиотека" і святочную праграмую. У гэты дзень для наведвальнікаў бібліятэкі працавалі: выстава-панарама новых паступленняў "Запрашаем у свет кнігі!", выстава электронных дакументаў "Эра электронных кніг", фотавыстава "У аб'ектыве - культурнае жыццё бібліятэк". На мерапрыемства былі запрошаны ветэраны бібліятэчнай справы, ўзнагароджаны лепшыя работнікі, гучалі словы віншаванняў.

Кожны жадаючы мог павіншаваць любімую бібліятэку, пакінуўшы самыя добрыя і шчырыя пажаданні.

**18 верасня** ў холе Воранаўскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці жыхары раёна маглі пазнаёміцца з выставай "У аб'ектыве - культурнае жыццё бібліятэк" і "Дасягненні бібліятэкі", прысвечанных 75-годдзю ўтварэння Гродзенскай вобласці

**24 верасня.** Кожны год раённая бібліятэка арганізуе розныя мерапрыемствы для людзей сталага ўзросту. Напярэдадні свята Дня пажылога чалавека на сустрэчу з удзельнікі аматарскага аб'яднання "Надзея" і супрацоўнікамі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва запрасілі ўрача эндакрынолага Воранаўскай раённай бальніцы Панёўкіну Таццяну Фёдараўну, якая вельмі падрабязна расказала аб эндакрынным захворванні, аб небяспецы атлусцення, аб збалансаваным харчаванні, аб прафілактыцы цукровага дыябету, а таксама аб значэнні спажывання дастатковай колькасці вітамінаў і вады ў сталым узросце, вымярэннем ўзроўню ўтрымання цукру ў крыві. Удзельнікі сустрэчы атрымалі адказы на пытанні, якія іх цікавілі. Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава "У гармоніі з узростам".

**24 верасня**. Супрацоўнікі раённай бібліятэкі арганізавалі ў рамках дэкады "Залаты ўзрост" віншавальную міні-акцыю "Пісьмо любімай бабулі", прысвечаную Дню пажылых людзей. З цёплымі віншаваннямі і кветкамі сустракалі людзей сталага ўзросту на вуліцах пасёлка. Пажылыя людзі пачулі ў свой адрас шчырыя пажаданні добрага здароўя, добрага настрою, актыўнага даўгалецця.

**25 верасня** адбылася гадзіна паэзіі "З любоўю да роднага краю" прычвечаная 95-годдзю з дня нараджэння Артура Вольскага (1924-2002), беларускага паэта.

## ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. ДЗЕНЬ СЛАВЫ І МУЖНАСЦІ.

**(да 75-годдзя з часу вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў)**

Ва ўсіх бібліятэках разгарнуліся мерапрыемствы, прысвечаныя галоўнаму святу краіны – Дню Незалежнасці. Традыцыйна былі арганізаваны кніжныя выставы: "Мая Радзіма - Беларусь", "Давайце ганарыцца што мы беларусы",

“Радзіма белых буслоў”, “Радзіма мая дарагая, красуй і ў шчасці жыві”, “Край любімы, непаўторны, родны”, “Мы – грамадзяне Беларусі”, “Адной табой ганаруся”, “Дзень памяці. Дзень гонару. Дзень Незалежнасці”, “Ганаруся табой, Беларусь”, “Твая зямля, твая Радзіма, названа светла – Беларусь!”.

Бібліятэкар *Бастунскай ІСБ* сумесна з цэнтрам культуры і дасуга правялі гістарычную гадзіну “Іх імёны ў гісторыі вёскі”, прысвечанае Дню Незалежнасці і 75-годдзю вызвалення Беларусі ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання сталых людзей і інвалідаў вёскі Бастуны. Вядучыя мерапрыемства распавядалі пра вызваленне Беларусі, а таксама вёскі Бастуны, якая была вызвалена 11 ліпеня 1944 года. Ушанавалі памяць хвілінай маўчання сваіх ветэранаў. Падчас мерапрыемства гучалі вершы, песні – якія ўсе разам спявалі. Цёплыя словы віншаванняў прымала ветэран Вялікай Айчыннай вайны Вера Філіпаўна Цімафеева, а таксама Гэлена Станіславаўна Еська, якой 1 ліпеня споўнілася 75 гадоў.

*Беняконская СБ-МЭ* правяла гадзіну гонару “Беларусь – мая слава, надзея і гонар!”. Удзельнікі мерапрыемства даведаліся аб вядомых дзеячах нашай краіны, паслухалі вершы беларускіх паэтаў аб родным краі. Літаратурна-паэтычную вечарыну “Як ты сэрцу майму міла, дарагая Беларусь” і “Мая краіна Беларусь” прапанавалі *Больцінікская і Пагародзенская СБ*. Літаратурна-паэтычны вечар “Твая зямля, твая Радзіма, названа светла – Беларусь!” арганізавала *Гіркаўская СБ*.

У гістарычны экскурс “Ад Мінска да Берліна” адправілія чытачы *Забалацкай ІСБ*. Гаварылі аб мужнасці тых, хто з першых дзён вайны ўстаў на абарону, пра веліч подзвігу беларускага народа, які абараняў нашу Радзіму ад фашысцкіх захопнікаў. Гучалі аўдыёзапісы песень “Нам нужна одна Победа”, “Тёмная ночь”, “Где же вы теперь, друзья-однополчане”, “День Победы”.

Дні інфармацыі “Квітней, красуй, дарагая Беларусь”, “Гэта ўсё – мая Беларусь”, “Беларусь – жыцця майго крыніца” правялі бібліятэкары *Больцішскай, Паляцкішскай ІСБ, Канвелішскай, Нацкай СБ, Радунскай ГПБ.*

## З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА КРАЮ.
## (Да Году малой радзімы)

У 2019 годзе бібліятэкамі працягваецца работа па бібліятэчнай праграме “Я люблю свой родны край” на 2016-2020гг.

З мэтай прыцягнення карыстальнікаў да чытання класікі і сучаснай беларускай літаратуры, павышэння чытацкай актыўнасці і статуса беларускай кнігі і мовы ў *Пагародзенскай СБ* прайшоў Дзень беларускай кнігі “Пра родны край з любоўю”. Удзельнікі сустрэчы дзяліліся сваімі эмоцыямі пра прыгажосць роднага края, чыталі і слухалі вершы пра родную мову, разгадвалі загадкі, узгадвалі прыказкі і прымаўкі, чыталі выказванні беларускіх дзеячаў. Таксама была праведзена гульня-віктарына “Беларусам я завуся, родным краем ганаруся”.

Добрай традыцыяй стала ў бібліятэках праводзіць сустрэчы, прысвечаныя творчасці нашых землякоў. Адна з такіх сустрэч насіла назву “І будзе слова землякоў, гучаць над роднаю старонкай”, якая праходзіла ў жніўні ў *Радунскай ГПБ*. Мерапрыемства сабрала землякоў рознага ўзросту. Іх аб’яднала цяга да вершаванага радка, зацікаўленасць гісторыяй і таямніцамі малой радзімы. Мясцовы краязнавец Іван Фясенка правёў невядомымі нам шляхамі па мінулым Воранаўшчыны. Ён

прывёў слухачам мноства прыкладаў аб багацці нашай зямлі на выбітныя постаці, знаходжанні на яе тэрыторыі ўнікальных касцёльных званоў, пра культавыя дрэвы, крыніцы і другія сакральныя аб’екты. Расказаў аб тым, што воранаўская зямля захоўвае мноства дзівосаў і запрасіў на экскурсіі ў народны гісторыка-краязнаўчы музей і ледніковых валуноў пад адкрытым небам Радунскай школы.

Любоўю да роднага слова было прасякнута выступленне члена Саюза пісьменнікаў Беларусі і земляка з Начы Уладзіміра Руля. Званнымі гасцямі мерапрыемства былі кампазітар Аляксандр Мацюк і паэт Міхаіл Забалотны. Яны прыгадвалі цікавыя гісторыі з маленства, юнацтва, якія потым сталі сюжэтамі іх твораў. Усіх расчуліў Аляксандр Антонавіч. Жанчыны не хавалі слёз, а мужчыны апусцілі галовы долу, калі ён прэзентаваў аўтарскія вершы і песні, прысвечаныя самаму дарагому чалавеку — матулі.

Пасля мерапрыемства землякі не спяшаліся пакідаць бібліятэку: дзяліліся ўражаннямі, успаміналі былое і любаваліся работамі таленавітай жыхаркі Радуні Лідзіі Адаміцкай.

Урок-падарожжа “Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!”, які арганізавала *Нацкая СБ,* пазнаёміў вучняў 11 класа з літаратурным мінулым роднага краю, яго традыцыях, гістарычных помніках. Бібліятэкар імкнецца з дапамогай такіх мерапрыемстваў выхаваць у дзяцей любоў і павагу да сваёй малой Радзімы.

Урок-падарожжа “Мне выпала шчасце тут нарадзіцца” правялі бібліятэкары *Воранаўскай ДБ* для вучняў 5 класаў. Свой аповяд вядучыя пачалі з падарожжа па цудоўнай краіне, якая завецца сінявокая Беларусь. Дзеці даведаліся, чаму наша краіна мае такую назву, аб яе гісторыі і культурнай спадчыне. Было прапанавана паўдзельнічаць у краязнаўчай віктарыне “Гэта наш з табою зямля, гэта наша з табою гісторыя”, дзе прысутныя паказалі свае выдатныя веды аб гісторыі Воранава. Дзеці з задавальненнем прынялі ўдзел у гутарцы-разважанні “Цудоўныя мясціны Воранаўшчыны”, кожны з асалодай і павагай расказаў пра свой любімы куточак роднага краю. Вядучыя пажадалі дзецям любіць і шанаваць свой край, сваю маленькую радзіму.

Пашырыць веды пра гістарычнае мінулае нашага беларускага краю, яго этнаграфічную, культурную спадчыну дапамагала літаратурна-музычная кампазіцыя “Табе, зямля бацькоў, нашы вершы і песні” якая адбылася ў *Канвелішскай СБ.*

Цікава прайшла завочная краязнаўчая экскурсія па вёсках раёна “Адкуль у вёскі імя” у *Воранаўскай ДБ*. Гаворка ішла пра нашу Радзіму, якая складаецца з мноства маленькіх куткоў і куточкаў і якія для кагосьці з’яўляюцца самымі лепшымі ў свеце, самымі дарагімі, адзінымі. Немагчыма ведаць сваю Радзіму, калі не ведаеш свой родны кут, сваё акружэнне. Якое месца мы займаем у свеце, дзе знаходзіцца наш кавалачак зямлі? Знаёмства з Беларуссю мы пачынаем з вывучэння роднага краю.

Па-сямейнаму цёплае, светлае, добрае, душэўнае. Менавіта такімі эпітэтамі можна ахарактарызаваць сустрэчу-успамін “Як даўно гэта было…”, якое адбылося ў *Бастунскай ІСБ*. Сустрэча аб’яднала землякоў, якія тысячамі нітак звязаны са сваёй тэрыторыяй, якія пражываюць побач з намі, шануюць і берагуць спадчыну мінулага. У аснову мерапрыемства лёг матэрыял з успамінаў жыхароў, якія ўзнавілі карціну

развіцця вёскі. Распавядаючы пра лёсы людзей, якія пражываюць у вёсцы Бастуны, мы пераконваемся, што ў кожнага свая сямейная гісторыя, свае дзіцячыя ўспаміны.

Гістарычная гадзіна "Па старонках мінулага нашага краю" знаёміла чытачоў *Тракельскай СБ* з таямніцамі і цудамі беларускай зямлі, прыадкрыла заслону яе славутай гісторыі, традыцый, даведаліся, якіх знакамітых людзей яна ўзгадавала.

Бібліятэкар *Бастунскай ІСБ* сумесна з настаўнікам пачатковых класаў НПК "Бастунская яслі-сад-базавая школа" правяла ўрок ведаў "Занімай Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!" з вучнямі пачатковых класаў. Дзеці чыталі вершы пра Радзіму, пра родны край. Бібліятэкар звярнула ўвагу дзяцей на кніжную выставу "Любы сэрцу край", прысвечаную Году малой радзімы і 75-годдзю ўтварэння Гродзенскай вобласці. Да іх увагі была паказана прэзентацыя "Мая Радзіма – вёска Бастуны", якая знаёміла з вядомымі людзьмі вёскі Бастуны.

Фолк-вандроўку па святах і абрадах "Ланцугом пляцецца, што было раней" арганізавала *Больцішская ІСБ*. Кожны чалавек мае права ганарыцца не толькі сваёй Радзімай – краінай, грамадзянінам якой з'яўляецца, але і Малой Радзімай – мясцовасцю, у якой ён жыве. Усё часцей людзі звяртаюцца да гісторыі сваіх продкаў, аднаўляюць забытыя традыцыі, захоўваюць памяць аб мінулым і перадаюць з пакалення ў пакаленне, каб у будучыні зноў не давялося па крупінках збіраць страчаныя звесткі пра родны край

## Да 75-годдзя з часу ўтварэння Гродзенскай вобласці.

*Воранаўская ДБ* разам з настаўнікам ДУА "Воранаўская дзіцячая школа мастацтваў" Пяцюн Гражынай прапанавалі дзецям прыняць удзел у віктарыне "Любі і знай свой родны край". Азнаёміўшыся з гісторыяй вобласці, удзельнікі пераканаліся ў тым, што Гродзеншчына сёння ў лідарах сярод іншых абласцей. Спіс ганаровых жыхароў рэгіёна папаўняецца новымі імёнамі. У рэгіёне размешчаны вядомыя ва ўсім свеце індустрыяльныя гіганты нашай краіны. Гродзенская вобласць вядомая ў Беларусі і за яе межамі сваёй неацэннай гісторыка-культурнай спадчынай, дзіўнымі творамі мастацтва. Гродзеншчыне па праве ёсць чым ганарыцца. Вобласць упэўнена крочыць наперад, у будучыню.

*Місявіцкая СБ* запрасіла сваіх чытачоў на гутарку-дыялог "Гродненский край, неповторимый, большой Беларуси малый уголок". На мерапрыемства былі запрошаны ганаровыя госці: ветэраны працы, старэйшыя жыхары мясцовасці. Актыўнымі ўдзельнікамі мерапрыемства сталі навучэнцы і настаўнікі ДУА "ВПК Місявіцкія яслі-сад-пачатковая школа". Сустрэча прайшла ў выглядзе дыялогу двух пакаленняў. Дзеці з вялікай цікавасцю ўслухоўваліся ў апавяданні і ўспаміны заслужаных і важных людзей, бо кожны эпізод іх працоўнай дзейнасці — гэта жывая гісторыя нашага краю. У сваю чаргу школьнікаў цікавілі свае пытанні, якія яны актыўна задавалі гасцям. Так прысутныя даведаліся аб дасягненнях нашай вобласці за 75 гадоў у розных сферах гаспадаркі, аб некаторых гістарычных фактах. А ў завяршэнні сустрэчы музычныя нумары падарылі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

*Нацкая СБ* арганізавала віншавальную акцыю "75 гадоў – разам!", для жыхароў в. Нача. Пры сустрэчы з аднавяскоўцамі, якім споўнілася 75 гадоў, бібліятэкар з самымі актыўнымі юнымі чытачамі віншавалі іх з Днём нараджэння, уручалі

інфармацыйныя закладкі з цікавымі фактамі з жыцця вобласці, а юныя чытачы вывучылі вершы нашых паэтаў і чыталі іх пры сустрэчы на вуліцы. Прыемным момантам гэтай акцыі стала тое, што землякі былі рады віншаванням і дзякавалі бібліятэкару.

## БІБЛІЯТЭКА – ДЗЕЦЯМ.

*Радунская ГПБ* запрашала ў госці да Алісы. Тут кожны знайшоў занятак па душы: малявалі, "пускалі" цягнікі, рыбачылі... таксама можна было пагартаць і пачытаць дзіцячыя кнігі, паўдзельнічаць у гульнях і конкурсах, сфатаграфавацца з Алісай і Капялюшнікам. Дзеткам прапаноўвалася пагуляць з развіваючымі цацкамі і пакатацца на арэлях. Цуды ад Алісы парадавалі ўсіх прысутных.

Бібліятэкар *Нацкай СБ* прапанавала сваім чытачам майстар-клас па дэкарыраванню розных прадметаў пад назвай "Ідэі для падарункаў". Удзельнікі паспрабавалі свае сілы ў гэтай не зусім стандартнай тэхніцы: пазнаёміліся з гісторыяй, відамі і спосабамі дэкарыравання. На прыкладзе ўбачылі, што, нават, з самых простых рэчаў можна зрабіць неверагодныя вырабы.

Чытанні на лужайцы "Сакрэты кніжнага лета" арганізавала *Пераганцаўская СБ*. За межамі бібліятэкі, на ўтульным лужку, размясціліся юныя аматары чытання. Дзеці самі выбралі кнігі, урыўкі з якіх яны зачытвалі ўслых. Чытанне выклікала непадробную цікавасць у слухачоў: "А што ж было далей?", "Чаму гэта адбылося?", "Чым жа скончылася?". Хтосьці адкрываў для сябе новы твор, але большасць дзяцей зачытвалі ўрыўкі з добра знаёмых ім апавяданняў вядомых аўтараў: М.Носава, Э. Успенскага, Ю. Дзмітрыева, Б. Захадэра, В.Драгунскага і іншых.

Гучныя чытанні ў пясочніцы "Я адпачываю з кнігай" для дзетак малодшага школьнага ўзросту арганізавала *Гіркаўская СБ*. Дзеці паслухалі казкі Карнея Чукоўскага, беларускія народныя казкі, а таксама пазнаёміліся з прыгожымі, маляўнічымі кнігамі, якія ёсць у бібліятэцы.

У *Радунскай ГПБ* прайшла акцыя "Кніжны чамаданчык" для дзяцей з дзіцячага сада "Падарожжа на паляне казак". На "лясную палянку" да дзяцей завітаў вясёлы клоун Клёпа з кніжным чамаданчыкам і вясёлымі гульнямі, загадкамі, танцамі.

Першакласнікі здзейснілі займальнае падарожжа ў свет кніг падчас экскурсіі ў *Воранаўскую ДБ*. Пазнаёміліся з правіламі карыстання бібліятэкай, асаблівая ўвага была нададзена маляўніча аформленым кніжным выставам. Таксама загадчык бібліятэкі Алена Велігор распавядала аб правільным абыходжанні з кнігамі, як выбіраць кнігі і як паводзіць сябе на абанеменце і ў чытальнай зале. Дзеці даведаліся, што такое "абанемент", "чытальная зала", "фармуляр", што кожная кніжка стаіць на сваім месцы і па якім прынцыпе кнігі размяшчаюцца ў бібліятэцы. Займальнай для дзяцей стала віктарына па казках "Што за хараство гэтыя казкі", у якой яны змаглі бліснуць сваімі ведамі. Усе без выключэння выдатна справіліся з заданнямі.

Для вучняў 1 класа Радунскай СШ была праведзена экскурсія па *Радунскай ГПБ*. Бібліятэкары наглядна пазнаёмілі дзяцей з фондам бібліятэкі, даведачным апаратам, паслугамі, з аформленымі кніжнымі выставамі і з мерапрыемствамі, якія праводзяцца. Самай цікавай часткай экскурсіі стала знаёмства з дзіцячым гульнёвым пакоем, дзе дзяцей чакалі займальныя вясёлыя гульні.

Экскурсія “Бібліятэка, кніга, мы – лепшыя сябры” дала магчымасць маленькім наведвальнікам *Воранаўскай ДБ* пазнаёміцца з пакоямі бібліятэкі, з рэжымам працы, растаноўкай кніг на паліцах, перыядычным друкам і правіламі паводзін у бібліятэцы. Дзеці пазнаёміліся з мастацкімі творамі для свайго ўзросту і прынялі ўдзел у казачнай віктарыне, і адгадванні загадак.

На аукцыён ведаў “Кнігі – спадарожнікі вучобы” у *Радунскую ГПБ* прыйшлі вучні 2 класа Радунскай СШ, якія не расставаліся з кнігай усе канікулы. Яны з задавальненнем расказалі аб прачытаных кнігах. Бібліятэкары арганізавалі для дзяцей захапляльныя конкурсы і цікавыя віктарыны. У заключэнні мерапрыемства бібліятэкары пажадалі дзецям добрай вучобы і не забываць, што ўсе цуды жывуць на кніжных паліцах і каб сустрэцца з імі, трэба зусім нямнога – чытаць кнігі.

Наведвальнікаў *Паляцкішскай ІСБ* зацікавіла акцыя “Лета з добрай кніжкай”. Незвычайная акцыя сабрала дзяцей не ў цішыні бібліятэчных паліц, а паклікала разам з кнігамі і часопісамі на свежае паветра. Акрамя гэтага, юныя чытачы актыўна прыводзілі ў бібліятэку сваіх сяброў, што прыехалі ў вёску на канікулы, рамантаваць кнігі.

“Летні кніжны круіз” ў *Бастунскай ІСБ* праходзіў пад дэвізам “Падарожнічай адзін, падарожнічай з сябрамі, падарожнічай разам з намі!”. Увазе дзяцей былі прадстаўлены кнігі і часопісы, якія ёсць у бібліятэцы. Бібліятэкар дала кароткія каментары па кожнай групе выданняў. Затым прапанавала прыняць ўдзел у гульні-віктарыне “Падарожжа па старонках любімых кніг” і вясёлых конкурсах. Каб адказаць на пытанні, удзельнікам выпрабаванняў неабходна было арыентавацца ў свеце дзіцячай літаратуры.

Пытанні з чароўнага слоіка “Запрашаем у карагод казачных прыгод” знаёмілі юных чытачоў *Больцінікскай СБ* з забытымі паданнямі, казкамі, рознымі пацешкамі, забаўлянкамі, жартамі.

Літаратурнае падарожжа “Ну-ка кніжка павярніся, ну-ка Казка - пакажыся” якое арганізавала для дзецей бібліятэкар *Больцінікскай СБ*. Дзяці пазнаёміліся з беларускімі народнымі казкамі, з літаратурнымі казкамі, аўтарамі якіх з'яўляюцца вялікія пісьменнікі-казачнікі: А. С. Пушкін, Г. Х. Андэрсан, Браты Грым, Ш. Перо, здзейснілі займальнае падарожжа ў чароўны свет казак. З задавальненнем адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарын, дапаўнялі імёны казачных герояў, злучалі назвы казак, па першых прапановах адгадвалі назвы рускіх народных казак, разгадвалі рэбусы, збіралі на хуткасць пазлы з малюнкамі з розных казак, разглядалі кнігі і часопісы. Падказкай да правільных адказаў на пытанні віктарын служылі кніжкі з выставы “Час казачных прыгод”.

## Рэспубліканская акцы “За бяспеку разам”

Урок бяспекі “Што рабіць калі…” прайшоў у *Воранаўскай ДБ*. На мерапрыемства быў запрошаны супрацоўнік Воранаўскага МНС Вінцкевіч А.С. і вучні 5-х класаў Воранаўскай сярэдняй школы. Загадчык філіялам Алена Велігор расказала наведвальнікам пра паводзіны ў экстрымальных сітуацыях, а выратавальнік правёў гульню па пажарнай бяспецы, паказаў прэзентацыю і ўручыў вучням падарункі ад МНС.

У *Доцішскай СБ* прайшла гульня-квэст “Бяспечнае дзяцінства”, накіраваная на папярэджанне пажараў і вывучэнне правіл паводзін пры іх узнікненні.

Бібліятэкар *Больцішскай ІСБ* наведала Больцішскую базавую школу з інфармацыйнай хвілінкай “Бяспека кожны дзень” па папярэджванню надзвычайных сітуацый.

## ПРА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ.

У 2019 годзе бібліятэкамі працягваецца работа па бібліятэчнай праграме “Стыль жыцця - здароўе” на 2016-2020гг.

Гадзіну карыснага “Усё аб вашым здароўі” прапанавала падлеткам *Бастунская ІСБ*. Бібліятэкар вітала дзяцей вясёлым вершам пра здароўе, расказала казку пра мікробы і стала размаўляць з дзецьмі аб тым, што такое чысціня, чаму мікробы так дрэнна ўплывалі на герояў казкі. Дзеці разважалі аб тым, як важна сачыць за сабой і быць чыстымі і акуратнымі. Далей рабят запрасілі зрабіць зарадку ўсім разам. Ірына Яўгеньеўна зачытвала вершаваную фізкультвілінку і разам з дзецьмі выконвала практыкаванні. Пасля вясёлых рухомых практыкаванняў адгадвалі загадкі. Завяршылася мерапрыемства аглядам кніг ля кніжнай выставы “Здаровы я - здаровая краіна”.

Урок здароўя “Летняя пара – вітамінаў гара” які адбыўся ў *Гіркаўскай СБ* знаёміў дзяцей з асноўнымі групамі вітамінаў, іх роляй у харчаванні чалавека, пералікам прадуктаў харчавання, якія змяшчаюць вітаміны. У працэсе мерапрыемства былі і сур'ёзныя заданні і заданні з гумарам. Дзецям давялося задумацца, калі шукалі зашыфраваныя словы пра здароўе, адгадвалі прадукты харчавання па апісанні, сартавалі ежу на шкодную і карысную, адказвалі на пытанні з падвохам аб рэжыме дня. Ад душы пасмяяліся, калі выконвалі жартоўную зарадку, малявалі віды спорту. Спадзяемся, што ўрок здароўя не прайшоў дарма, і дзеці многае запазычылі з яго.

Валеалагічны занятак “Надо всем ребятам знать, как здоровым, крепким стать” арганізавалі бібліятэкары *Радунскай ГПБ*. З цікавасцю і захапленнем дзеці адказвалі на пытанні віктарыны і адгадвалі загадкі аб здаровым ладзе жыцця. Даведаліся шмат новага аб правільным харчаванні, асабістай гігіене і карысці заняткаў спортам. Адзначылі для сябе, якія прадукты карысныя для арганізма, што такое вітаміны, і чаму карысна выконваць рэжым дня. Затым дзеці разам з бібліятэкарамі правялі вясёлую фізкультвілінку, якая спрыяе ўмацаванню здароўя. Больш за ўсё школьнікаў зацікавіла гульня “Рэжым дня”, дзе кожны ўдзельнік павінен быў правільна расказаць пра свой рэжым дня. У конкурсах удзельнічалі ўсе жадаючыя, неабыякавыя да свайго здароўя. У канцы мерапрыемства дзеці падзяліліся ўласным досведам пра тое, як берагчы здароўе і весці здаровы лад жыцця.

*Нацкая СБ* арганізавала займальную экскурсію ў свет лекавых раслін “Лекавыя расліны вакол нас”. Удзельнікам мерапрыемства бібліятэкар нагадала, што расліны - гэта дзіўныя і дасканалыя тварэнні, яны захоўваюць у сабе шмат сакрэтаў. У самай маленечкай расліне можа хавацца вялікая сіла, здольная лячыць розныя чалавечыя хваробы. “Зялёная фабрыка” прыроды сотні тысяч гадоў забяспечвае чалавецтва надзейнымі лячэбнымі сродкамі. З вядомых на зямлі 50

тысяч відаў раслін больш за 12 тысяч складаюць лекавыя расліны, гаючыя ўласцівасці якіх выкарыстоўваюцца ў сучаснай медыцыне. Аб карысных уласцівасцях лекавых раслін распавёў урач-зёлкін, працоўнае месца якога было аформлена таблічкай, даведнікамі па фітатэрапіі і букецікамі засушаных лекавых раслін. Удзельнікі экскурсіі падзяліліся сваімі ведамі пра карысць некаторых раслін. У заключэнне ж мерапрыемства ўсім прысутным у працэсе мерапрыемства раздалі закладкі з рэцэптамі прыгатавання лекавых настояў.

Актуальную размову “Падлетак і наркотыкі” прапанавала *Больцішская ІСБ.* Пасля ўступнай гутаркі бібліятэкара падлеткі ўбачылі прэзентацыю аб наркатычнай залежнасці і наступствах злоўжывання наркотыкамі, паглядзелі відэафільм “Права на жыццё”. У фільме гучалі рэкамендацыі для дзяцей, якія апынуліся перад выбарам: спрабаваць наркотык, або сказаць ім цвёрдае “не”. Дзеці з цікавасцю ўспрымалі дадзеную інфармацыю, было відаць, што ўбачаныя матэрыялы зрабілі на іх моцнае ўражанне.

## ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА.

Бібліятэкары *Воранаўскай ДБ* запрасілі вучняў 5 “Б” класа адправіцца на экспрэсе ў мінулае кніганапісання і друкавання “На світанку кнігадрукавання”. Разам з класным кіраўніком Шаматовіч Д.Б. прайшлі шлях узнікнення кнігі ад X стагоддзя да сучаснага дня. З дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі пазнаёміліся з першаасветнікамі Беларусі.

Бібліятэкар *Доцішскай СБ* прапанавала дзецям прыняць удзел у гістарычным уроку “Шляхам асветніка Францыска Скарыны”. Урок праходзіў у форме інтэрактыўнага дыялогу. Гаварылі аб гісторыі ўзнікнення бібліятэчнай прафесіі, глядзелі відэаролік пра асноўныя этапы развіцця выдавецкай справы ў Беларусі, адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны і актыўна ўдзельнічалі ў гульні “Адшукай і выправі памылку”.

Чытачы *Бастунскай ІСБ* знаёміліся з гісторыяй кнігадрукавання з дапамогай кніжная выставы-агляда “Натхняе вобраз Скарыны”. Падчас гістарычнай гадзіны “Волаты беларускага пісьменства” бібліятэкар *Больцішскай ІСБ* прадставіла ўдзельнікам гісторыю развіцця пісьменства ў Беларусі, расказала пра знакамітых асветнікаў беларускай зямлі.

Урок гісторыі “Шляхам асветніка Скарыны” правяла *Доцішская СБ.* Школьнікі пазнаёміліся з гісторыяй кнігадрукавання ад вытокаў да нашых дзён, а таксама аб жыцці і дзейнасці беларускага першадрукара Францыска Скарыны, адказалі на пытанні віктарыны “Невядомы Скарына”.

Пра першадрукара Францыска Скарыну і іншых культурных дзеячаў, жыццё якіх звязана з кнігавыданнем, распавяла бібліятэкар *Нацкай СБ* на арганізаваным ёю экскурсе ў мінулае “Шляхам асветніка Скарыны”.

## ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

З нагоды святкавання Дня пажылых людзей у *Місявіцкай сельскай бібліятэцы* сабраліся госці і чытачы сталага ўзросту на тэматычны вечар “Цяплом сагрэем вашы душы”. На святочнае застолле прыйшлі жанчыны рознага ўзросту, розных прафесій і кожная са сваім жыццёвым лёсам. Але ва ўсіх іх за плячыма вялікі працоўны

вопыт. Шмат прагучала апавяданняў аб сваіх працоўных буднях і святах, якія выпадалі вельмі рэдка. Кожнай з іх хацелася расказаць аб сваіх дзецях, унуках, каму-то нават ужо праўнуках. Увазе прысутных была прадстаўлена забаўляльная праграма, дзе знайшлося месца песням, танцам, цікавым гульням.

Нарыхтоўкі, кансервы, зробленыя сваімі рукамі, не могуць параўнацца з пакупнымі. Бо кожны слоічак – гэта ваш сакрэт, гэта ваша мастацтва. І менавіта для тых, хто любіць тварыць, у *Канвелішскай СБ* адбылася прэзентацыя выставы-рэцэпта “Заготовки для сытной зимовки”. На выставе таксама былі прадстаўлены выданні, у якіх чытачы знойдуць спосабы захоўвання і прыгатавання хатніх нарыхтовак, цікавыя і незвычайныя рэцэпты кансервавання, сушкі і замарожвання сабранага ўраджаю, практычныя парады і рэкамендацыі, як хутка і з найменшымі выдаткамі парадаваць сваю сям'ю, сваіх сяброў смачнымі, духмянымі і карыснымі нарыхтоўкамі.

*Бастунская ІСБ* правяла віншавальную міні-акцыю “Са святам!”, падчас якой бібліятэкар наведвала свіх аднавяскоўцаў з пажаданнямі дабрыні, кахання і моцнага здароўя.

## У ЗГОДЗЕ З ПРЫРОДАЙ.

Роля бібліятэк у экалагічнай асвеце насельніцтва адлюстроўваецца праз рэалізацыю мэтавай праграмы **“Наш дом - прырода” на 2016-2020гг**.

*Канвелішская СБ* для наведвальнікаў дзіцячага сада арганізавала экскурсію ў парк “Экалагічная вандроўка”. Спачатку бібліятэкар нагадала дзецям правілы паводзін у парку, а затым разам адправіліся ў займальнае падарожжа. Кожны крок па сцяжынках – гэта віктарына або гульня: “Загадкавае дрэва”, “Чароўная кветка”, “Жыхары парку”, “Смачныя пачастункі”. Асаблівая ўвага дзяцей была звернута на тое, як і чым жыве зімовы і летні парк, веснавы і восеньскі, якія змены ў раслінным і жывёльным свеце адбываюцца на працягу года.

У мэтах выхавання любові да роднай прыроды, да братоў нашых меншых, развіцця назіральнасці і цікавасці да навакольнага свету, у *Больцінікскай СБ* праведзены пазнавальна-экалагічная гадзіна “Мир зверей и птиц сходит со страниц”. На кніжнай выставе былі прадстаўлены творы М. Прышвіна, Я. Чарушына, Д. Маміна-Сібірака, Э. Сэтан-Томпсана, В. Астаф'ева, К. Паўстоўскага, Н. Сладкова, У. Ягоўдзіка. Менавіта творчасць гэтых пісьменнікаў выхоўвае пачуццё прыгажосці і беражлівыя адносіны да свету жывой прыроды. Пасля ўступнай часткі і абмеркавання прадстаўленых кніг, мерапрыемства працягнулася забаўляльна-пазнавальнай праграмай.

Свае веды і эрудыцыю вучні 8,9 класаў прадэманстравалі адправіўшыся ў экалагічную экспедыцыю “Экология - дело всех и каждого”, якую падрыхтавала і правяла *Пагародзенская СБ*. Вучні адкрылі для сябе шмат новага і цікавага, атрымалі дастатковую колькасць добрых эмоцый.

Падчас экалагічнага дэсанта “З павагай да ўсяго жывога” бібліятэкар *Бастунскай ІСБ* распавяла аб ролі раслін і жывёл у жыцці людзей. Дзеці з задавальненнем расказвалі пра сваіх гадаванцаў, аб тым, як даглядаюць за імі. Успомнілі правілы паводзінаў у прыродзе і патрабавалі выканання іх ад сваіх сяброў. Пасля мерапрыемства ўсе дзеці выбралі сабе кнігі для чытання дома.

Экалагічная віктарына “Реки и моря на земле живут не зря” адбылася ў *Больцішскай ІСБ.* Удзельнікамі мерапрыемства сталі вучні 2 -3 класаў. Дзеці паразважалі: а ці ўсякая вада падыходзіць для нашых патрэб, прачыталі вершы пра ваду. Бібліятэкар прывяла школьнікам цікавыя факты аб вадзе. Актыўна распавядалі, як трэба ахоўваць ваду і берагчы яе. Дзяліліся сваімі гісторыямі пра адпачынак ля мора або купанне ў рэках.

У экалагічную экспедыцыю “Дом, в котором мы живём” адправіліся юныя чытачы *Гіркаўскай СБ,* дзе даведаліся, што ёсць жывая і нежывая прырода. Здзейснілі прагулку ў лес, пазнаёміліся з ляснымі жыхарамі. Падарожнічаючы, даведаліся пра самых розных з'явах прыроды: тумане, дажджы, расе, інеі, градзе, вясёлцы. Адгадвалі загадкі пра птушак, называлі казкі, у якіх галоўным героем з'яўляюцца жывёлы, адказвалі на пытанні па экалогіі, удзельнічалі ў розных конкурсах. У канцы мерапрыемства прыйшлі да высновы, што наша зямля-дзіўная планета і другі такі на свеце няма.

## ПРАВАВОЕ ВЫХАВАННЕ.

Каб павысіць прававую культуру дзяцей і падлеткаў у *Больцінікскай СБ* прайшоў марафон прававых ведаў У гасцях у дзеда Правaведа” .

Гадзіну прававых ведаў “Правапарушэнні і адказнасць” арганізавала *Гіркаўская СБ* з праглядам відэафільма. Аўтары стужкі паказалі эпізоды з жыцця малалетніх злачынцаў адной з выхаваўчых калоній краіны. Там, за калючым дротам, на волі, засталіся сябры, дзяцінства, родныя і здзейсненае імі злачынства, за якое трэба несці адказнасць.

Гульня-эстафета “Прававы лабірынт” прайшла ў *Жырмунскай ІС*Б з удзельнікамі аматарскага аб’яднання “Грамадзянін”. У форме гульні, што такое права і навошта ведаць свае правы і абавязкі, прайшло знаёмства з інфармацыйным прадуктам “Дзіцячы прававы сайт”. Сайт быў заснаваны Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі РБ у 2008 годзе і з таго часу стаў выдатным памочнікам у вывучэнні правоў і абавязкаў. Інфармацыя на ім прадстаўлена ў цікавай і дасягальнай для малых форме праз гульнёвыя сітуацыі. У падарунак юныя чытачы атрымалі інфармацыйныя лістоўкі, а разам з тым цікава і карысна правялі час.

“Что должен знать подросток, чтобы невинная шалость не превратилась в злонамеренный поступок?” вось гэтыя пытанні разглядаліся падчас прававой сітуацыі ў *Забалацкай ІСБ.* Бібліятэкар расказала дзецям пра тое, як наша дзяржава абараняе правы дзяцей, а таксама прывяла прыклады, калі б, здавалася, несур’ёзнае свавольства прыводзіць да бяды.

Марафон прававых ведаў “Правознайка” для малодшых школьнікаў арганізавала *Пагародзенская СБ.* Юныя чытачы пазнаёміліся з асноўнымі правамі дзіцяці, замацаванымі ў міжнародных дакументах аб правах дзіцяці. Пад заслону мерапрыемства школьнікам было прапанавана згуляць у тэатралізаваным прадстаўленні казак “Чырвоная Шапачка”, “Бураціна”, у якіх былі парушаныя правы дадзеных герояў.

# ТАЛЕНТЫ ЛІТАРАТУРНАГА СЛОВА.

На працягу трэцяга квартала бібліятэкі раёна адзначалі юбілеі беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, прапагандавалі іх творы.

**Да 85-годдзя з дня нараджэння Змітро Бяспалага (1934-1999), беларускага пісьменніка.** Да гэтай даты *Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка* арганізавала падарожжа па казках аб прыродзе “Лясныя хітруны”. Літаратурную гадзіну “Лясныя хітруны: замалёўкі, апавяданні, казкі” прапанаввла *Беняконская СБ-МЭ.* Воранаўская ДБ арганізавала літаратурны ералаш “Казкі ад Змятро Бяспалага”. Чытачы доцішскай СБ знаёміліся з творчасцю пісьменніка праз кніжную выставу-знаёмства “Лясныя хітруны: замалёукі, апавяданні, казкі”.

**Да 100-годдзя з дня нараджэння Алеся Асіпенкі (1919-1994), беларускага пісьменніка** ў бібліятэках былі арганізаваны кніжныя выставы, праведзены гадзіны цікавых паведамленняў, агляды літаратуры, падарожжы па творчасці: “З вышыні пражытых гадоў”, “З увагай да звычайнага”, “Адчуванне часу”.

*Доцішская сельская бібліятэка* прысвяціла творчы партрэт “Не здраджваць сваім прынцыпам”. На мерапрыемстве дзеці пазнаёміліся з яго творчасцю, з яго апавяданнем «Пяцёра адважных» .

*Бастунская ІСБ* прапанавала сваім наведвальнікам юбілейную паліцу “Святло жыцця”. Творчы партрэт “Не здраджваць сваім прынцыпам” арганізаввла *Больцініцкая, Доцішская Місявіцкая СБ.*

**Да 95-годдзя з дня нараджэння Артура Вольскага (1924-2002), беларускага паэта** бібліятэкі падрыхтавалі кніжныя выставы “Між сцежак жыццёвых”, “Падарожжа па краіне беларусаў”, “Я вандрую па краіне, дзе жыву” і наступныя мерапрыемствы:

- гутарка-партрэт і бібліяграфічны агляд “Наш добры сябра – Артур Вольскі” (*Воранаўская ДБ, Тракельская СБ*);
- гутарка па творах “Жыццё дадзена для добрых спраў” (СБ);
- дзень паэзіі і паэтычны вернісаж “Слова аб роднай прыродзе” (*Бастунская ІСБ, Радунская ГПБ*);
- літаратурнае падарожжа “Па краіне беларусаў” (*Нацкая СБ*);
- ранішнік “Падарожжа ў казкі Артура Вольскага” (*Пагародзенская СБ*);
- гутарка “Нам прырода падарыла хараство крыніц і траў” (*Пераганцаўская СБ).*

# ДА ДНЯ ВЕДАЎ

Як заўсёды бібліятэкары прынялі актыўны ўдзел у правядзенні Дня ведаў. *Нацкая СБ* арганізавала для школьнікаў літаратурны вернісаж “Наша школьная краіна”, а *Доцішская СБ* правяла Дзень ведаў “Які ж гэта цуд – слова, мова твая!”, *Паляцкішская ІСБ* арганізавала свята “Вітаем цябе, верасень! Любім цябе,школа”. Конкурс ведаў “Адзнакі без мінусаў” правяла *Пераганцаўская С*Б. Ранішнік “Гучна звіні, наш званочак” быў прпанаваны вучням малодшых класаў у *Забалацкай ІСБ.* Чытачы *Пагародзенскай СБ* адправіліся ў “Вандраванне па акіяне Ведаў”. Наведалі загадкавы порт Геаграфія, паўвостраў Грамацеяў, мыс Вясёлых матэматыкаў, востраў Чунга-Чанга, горад Чытайка. Закончылася вандраванне прысягай на вернасць школе і настаўнікам, захавальнікам Ведаў. Выстава “Добры дзень, школа!”

прыцягвала ўвагу чытачоў *Бастунскай ІСБ* кнігамі пра школу і настаўнікаў, яркімі ілюстрацыямі і кляновым лісцем з вясёлымі вершамі.

## УДАСКАНАЛЬВАЕМ ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА.

Павышэнне кваліфікацыі, удасканаленне прафесіяналізму бібліятэчных спецыялістаў раёна з'яўлялася адным з вядучых напрамкаў метадычнай работы.

18 ліпеня *практыкум* ***"Работа з беларускай кнігай – прыярытэтны накірунак ў дзейнасці"***. У праграме практыкума быў агляд твораў беларускіх аўтараў "Новыя аўтары і актуальныя жанры беларускай кнігі", кансультацыя "Папулярызацыя беларускай літаратуры і мовы, адзін з прыярытэтных накірункаў дзейнасці бібліятэк", метадычныя парады "Размаўляем і чытаем па-беларуску: сучасныя формы раскрыцця фонду беларускай літаратуры".

***"Краязнаўста як адзін з найважнейшых напрамкаў работы бібліятэкі"*** тэма чарговай школы прафесійнага майстэрства, якая адбылася 22 жніўня. Разглядаліся наступныя пытанні: "Краязнаўча-бібліяграфічная дзейнасць сельскай бібліятэкі", "Дзейнасць этнаграфічных экспазіцый, музеяў, кніжных выстаў у публічных бібліятэках і іх значэнне ў выхаванні любові да роднага краю", "Воранаўшчына ў творах і лёсах землякоў".

Бібліятэкары *Беняконскай СБ-МЭ, Пагародзенскай, Місявіцкай СБ* падзяліліся вопытам работы з сваімі калегамі аб выкарыстанні краязнаўства ў сваёй рабоце і ў якасці прыкладу паказалі электронную прэзентацыю "Ад вытокаў - да вечнага".

19 верасня на базе раённай бібліятэкі прайшоў ***практыкум "Інавацыйныя формы мерапрыемстваў: арганізацыя і тэхналогія правядзення".*** Былі адзначаны лепшыя вынікі работы ў пошуку інавацый. Загадчык АБМ дала кансультацыю "Інавацыі ў рабоце бібліятэк як сродак павышэння інтарэсу да чытання".

24 кастрычніка супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу арганізавалі для сельскіх бібліятэк ***школу прафесійнага майстэрства*** на тэму ***"Аматарскія аб'яднанні ў біьбліятэках: методыка арганізацыі работы"***. Сустрэча пачалася з дэманстрацыі слайдаў аб рабоце аматарскіх аб'яднанняў раёна, затым былі дадзены метадычныя парады пра сучасныя формы работы з дзецьмі і падлеткамі ў аматарскіх аб'яднаннях, і пра асаблівасці работы аб'яднанняў для дарослых, як арганізатараў інтэлектуальнага правядзення вольнага часу.

# СТАРОНКІ БІБЛІЯТЭЧНАГА ЖЫЦЦЯ ВОРАНАЎШЧЫНЫ

***Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь***
***III квартал***
***Выпуск 59***

Складальнік Юрго Вольга Мар'янаўна
Адказны за выпуск Т.Р.Сушынская

Камп'ютэрны набор В.М.Юрго
Мастацкае афармленне В.М.Юрго

Падпісана да друку: 16.10.2017 года
Тыраж 4 экз. Заказ № 213

Надрукавана на камп'ютэры Воранаўскай раённай бібліятэкі
231391 г.п.Воранава, вул.Савецкая,29